# БЕРАСТАВІЦКАЯ СЯСТРА ХАТЫНІ

Ёсць у нашым раёне сястра Хатыні - вёска Верхаўляны. З тых жудасных падзеяў прайшло шмат часу. Жывыя штогод памінаюць загінуўшых. І сёлета ў Гольнеўскай царкве ў Дзень Перамогі айцец Анатолій адслужыў літургію, на якой памянуў усіх загінуўшых верхаўлянскіх мужчын.

Потым усе людзі пайшлі да помніка…



***Памятны знак у в. Верхаўляны.***

…Сведкаў тых жудасных падзеяў застаецца ўсё менш і менш. Тым большую каштоўнасць для нашчадкаў маюць іх успаміны.

Вось як захавалася ў памяці Міхаіла Уладзіміравіча Лапаціка тая жудасная трагедыя:

-Я ў той дзень каровы за брата пагнаў пасвіць. Карова чагосьці спалохалася, пабегла. Я за ёю пагнаўся і трапіў у рукі немцу. Бачу: уся вёска немцамі ачэпленая.

Мы жылі ў лесе, там хатка стаяла. Ляснік раней у ёй жыў, але пабудаваў сабе хату ў Песках і выехаў. Бацьку яшчэ да вайны сказалі, каб перасяляўся туды і вартаваў лес.

Немцы хацелі ачапіць і вёску Гольні. Яны шукалі партызан, а тыя ў пустой хатцы сядзелі. Солтыс, казалі, данёс немцам. Калі вёску ачапілі, адзін партызан стрэліў у немца і ўсе ўцяклі. Яны маглі ўцячы і не страляючы. А стрэл той людзям столькі бедаў нарабіў.

Тады немцы аставілі Гольні ў пакоі, і адправіліся ў Верхаўляны. Мужчын забралі ўсіх да адзінага: 31 чалавек, сярод іх мой бацька, сваякі. Павезлі ў Малую Бераставіцу. Жанчын з дзецьмі сагналі пад царкву. А потым вёску падпалілі.

Мяне, як я пагнаўся за кароваю, немец схапіў, прыставіў да плоту і нацэліўся дулам аўтамата ў жывот: стой, не варушыся. Што мяне чакала, не ведаю, але смерць тады абмінула. Выратаванне прыйшло ў асобе жанчыны, адной з тых, якіх нагналі дабро разбіраць. Не ведаю, з якой яна вёскі. Прозвішча, здаецца, Мянькоўская. Яна трохі па-нямецку гаварыла. Падышла да мяне, распытала, чаму я тут, і немца ўсё прасіла, каб адпусціў: «Дзіця гэта яшчэ», - кажа яна. Немец не паддаецца. Тады яна да афіцэра. Што гаварыла яму, як прасіла, не ведаю. Толькі помню,

як мой вартавы як гаркне: лёйз нах хаўзе! Паўтараць мне не трэба было. Як толькі ён аўтамат апусціў, я куляй панёсся далей ад бяды.

Ачэпленыя жанчыны стаялі каля царквы. Плакалі дзеці, многім нават апрануцца не далі, захінуцца ў што. Стаялі і чакалі. Вёска гарыць, жанчыны ў жаху, туляць да сябе маленькіх дзяцей, плакаць баяцца. Потым з Эйсмантаў нейкі афіцэр прыехаў і выдаў загад: усіх адпусціць.

- Адна жанчына, - гэта дапаўняе свайго гаспадара жонка Міхаіла Уладзіміравіча Соф'я Васільеўна, - адумалася, што мужа без дакументаў забралі. Паслала сына, каб пашпарт бацьку занёс. А немцы за хлопца і да мужчын. Так і згінуў бедны. Вера Петух, яго сястра, у нас жыве. Брату 12 гадоў было. Іх з Малой Бераставіцы пасля ў Беласток забралі. Ні адзін не вярнуўся дадому.



***Мітынг у помніка. 9 мая 2009 года.***

Адзін чалавек з Петруліна каня пад Верхаўляны пасвіць прывёў. Жонка казала: чаго ты лезеш у бяду. А ён упэўнены быў, што яго не забяруць, бо ні ў чым не вінаваты. Забралі, і ніхто яго слухаць не стаў.

А яшчэ з Малой Бераставіцы адзін прыязджаў у Верхаўляны торпу (торф) капаць. Хацеў ужо дахаты ехаць, а потым надумаў яшчэ адну ноч пераначаваць. Ну, і пераначаваў. Дадому ўжо ніколі не вярнуўся.

Я плачу, калі муж расказвае. Што ж рабілі тыя жонкі з дзецьмі, голыя, босыя, галодныя?! Куды ісці, дзе прытулак шукаць? Многія жабравалі, хто да родных падаўся, а больш на папялішчах засталіся. Добра, што цяпло ўжо было, на лета бралася. Дзеці павыжывалі, але нацярпеліся, не дай Божа. Пайшлі па людзях, хто пастушкамі, хто як, каб толькі крупніку якога налілі...

Няма ўжо ў жывых многіх тых удоваў. У Верхаўлянах толькі адна засталася Надзея Лапацік, сама з Даўбянкоў, а ў Верхаўляны выйшла замуж. Здароўя жанчына не мае і расказваць пра тыя дні не можа.

Некаторыя потым павыязджалі. Жыве яшчэ Марыя Георгіеўна Карытка. Гэта яе потым, пасля вайны, дэпутатам сельскага Савета выбралі. А яшчэ пазней у вёсцы калгас арганізаваўся. Яго так і назвалі «8 Сакавіка», бо ніводнага старэйшага мужчыны не было, толькі дзеці падросшыя ды ўдовы. Марыя Георгіеўна сама з Малых Жукевіч, а замужам была ў Верхаўлянах. Чацвёра дзяцей: яе сын і суседскія -

зімавалі ў цагляным свірне, які не згарэў. «Зімою дзеці спаць палягуць, а ў іх валасы да сцяны прымерзнуць», - успамінала жанчына. Марыю Георгіеўну Карытка, як самую баявую, геройскую, як тады казалі, выбралі старшынёй першага, жаночага наскрозь, калгаса.

Вось пра якія падзеі ўспаміналі людзі на свята Перамогі ў Верхаўлянах і Гольнях. Вось пра што многія маўчалі, бо гаварыць проста не маглі...

Ніна Абрамовіч, 2004 год.